Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_____________С.Л. Шпарло
«5» чэрвеня 2023 г.
Рэгістрацыйны № ВД-590эвуч.

# КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА І ТУРЫЗМ

*Праграма дзяржаўнага экзамену*
*па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-23 01 12-04 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (культурная спадчына і турызм)*

2023

Праграма дзяржаўнага экзамену складзена на аснове адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі АСВА 1-23 01 12-2021 па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках), зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 12 красавіка 2022 г. №75, вучэбнага плана БДУКМ па спецыяльнасці

**СКЛАДАЛЬНІКІ**

*Д.В. Герасімёнак,* загадчык кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі;
*А.М. Нароўская,* дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
*І.І. Бамбешка,* дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі;
*І.Г. Лупашка,* дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ**

*А.В. Вайцяховіч,* загадчык аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу дзяржаўнай навуковай ўстановы «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
*В.М. Сакалова,* дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ**

Кафедрай гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
(пратакол № 7 ад 27.01.2023 );

Саветам факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
(пратакол № 6 ад 21.02.2023);

Прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
(пратакол № 5 ад 15.03.2023 ).

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дзяржаўны экзамен “Культурная спадчына і турызм” праводзіцца згодна з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках).

Праграма дзяржаўнага экзамену складаецца з трох раздзелаў: “Тэорыя і методыка музейнай справы”, “Ахова гісторыка-культурнай спадчыны”, “Гісторыя і арганізацыя турызму”. Такая структура праграмы дазваляе лагічна і сістэмна размеркаваць вучэбны матэрыял.

Экзамен праводзіцца з мэтай праверкі ўзроўню і якасці ведаў выпускніка згодна з патрабаваннямі адукацыйнага стандарта па спецыяльнасці.

Пры падрыхтоўцы выпускнікоў да экзамену па раздзеле “Тэорыя і методыка музейнай справы” неабходна засяродзіць увагу на пытаннях, звязаных з агульнай тэорыяй музеязнаўства, асноўнымі метадычнымі аспектамі розных кірункаў музейнай дзейнасці.

Раздзел праграмы “Ахова гісторыка-культурнай спадчыны” уключае пытанні станаўлення, развіцця і функцыянавання помніка-ахоўнай дзейнасці і яе нарматыўна-прававога забеспячэння.

Пры засваенні пытанняў, уключаных у раздзел праграмы “Гісторыя і арганізацыя турызму”, выпускнік павінен звярнуць увагу на тэарэтычныя асновы, генезіс і эвалюцыю турызму, спосабы функцыянавання турыстычных арганізацый і рэалізацыю імі турыстычных паслуг, маркетынгавыя стратэгіі і інавацыйныя працэсы ў турызме.

Значную дапамогу ў засваенні пытанняў праграмы можа аказаць спіс рэкамендуемай літаратуры.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі АСВА 1-23 01 12-2021 па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках), выпускнік на дзяржаўным экзамене “Культурная спадчына і турызм” павінен валодаць:

Універсальнымі кампетэнцыямі:

УК-1. Валодаць асновамі даследчай дзейнасці, ажыццяўляць пошук, аналіз і сінтэз інфармацыі;

УК-2. Вырашаць стандартныя задачы прафесійнай дзейнасці на аснове прымянення інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій;

УК-3. Ажыццяўляць камунікацыі на замежнай мове для вырашэння задач міжасобаснага і міжкультурнага ўзаемадзеяння;

УК-4. Працаваць у камандзе, талерантна ўспрымаць сацыяльныя, этнічныя, канфесійныя, культурныя і іншыя адрозненні;

УК-5. Быць здольным да самаразвіцця і ўдасканалення ў прафесійнай дзейнасці;

УК-6. Праяўляць ініцыятыву і адаптавацца да зменаў у прафесійнай дзейнасці;

УК-7. Валодаць гуманістычным светапоглядам, якасцямі грамадзянскасці і патрыятызму;

УК-8. Валодаць сучаснай культурай мыслення, выкарыстоўваць асновы філасофскіх ведаў у прафесійнай дзейнасці;

УК-9. Аналізаваць і ацэньваць сацыяльна значныя з’явы, падзеі, працэсы, праяўляць прадпрымальніцкую ініцыятыву і рэалізоўваць навуковыя, сацыяльныя інавацыі;

УК-10. Планаваць, арганізоўваць і весці менеджарскую, маркетынгавую і фінансавую дзейнасць у музеях і ўстановах культуры;

УК-11. Валодаць дзяржаўнымі мовамі для ажыццяўлення прафесійнай камунікацыі, падрыхтоўкі навуковых тэкстаў;

УК-12. Выяўляць фактары і механізмы гістарычнага развіцця, вызначаць грамадскае значэнне гістарычных падзей;

УК-13. Валодаць навыкамі здароўезберажэння.

Базавымі прафесійнымі кампетэнцыямі:

БПК-1. Валодаць класічнай мовай на ўзроўні, дастатковым для разумення і інтэрпрэтацыі гістарычных крыніц;

БПК-2. Прымяняць тэарэтычныя і метадалагічныя асновы гістарычнакультурных і музеялагічных ведаў у дзейнасці сучаснага музея і даследаваннях археалагічных аб’ектаў сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны;

БПК-3. Аналізаваць і ацэньваць асноўныя гістарычныя падзеі і працэсы, дасягненні сусветнай і айчыннай культуры, агульныя заканамернасці фарміравання гісторыка-культурнай спадчыны;

БПК-4. Інтэрпрэтаваць гісторыю сусветных цывілізацый, вызначаць асаблівасці этнічных супольнасцяў, культур і іх эвалюцыю, агульную сацыяльна-культурную сітуацыю;

БПК-5. Характарызаваць асноўныя тэндэнцыі рэгіянальнага культурнага развіцця, вылучаць, фармуляваць і ацэньваць ключавыя напрамкі і асаблівасці развіцця розных этнакультурных рэгіёнаў;

БПК-6. Вылучаць асноўныя этапы і крыніцы фарміравання гісторыкакультурнай спадчыны, комплекс яе характарыстык;

БПК-7. Валодаць сучаснымі методыкамі вывучэння, актуалізацыі і інтэрпрэтацыі матэрыяльных і нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей;

БПК-8. Прымяняць асноўныя метады абароны вытворчага персаналу і насельніцтва ад негатыўных уздзеянняў фактараў антрапагеннага, тэхнагеннага, прыроднага паходжання, прынцыпы рацыянальнага прыродакарыстання і энергазберажэння, забяспечваць здаровыя і бяспечныя ўмовы працы

Дзяржаўны экзамен праводзіцца ў форме вуснага адказу студэнта на тры пытанні білета: адно па раздзеле “Тэорыя і методыка музейнай справы”, другое па раздзеле “Ахова гісторыка-культурнай спадчыны”, трэцяе па раздзеле “Гісторыя і арганізацыя турызму”.

Пры адказе на пытанні экзаменацыйнага білета выпускнік павінен прадэманстраваць грунтоўныя веды ў галіне музейнай, ахоўнай і турыстычнай дзейнасці, добрае валоданне матэрыялам, самастойнасць мышлення, уменне выкарыстоўваць веды сумежных галін ведаў.

На падрыхтоўку да адказу на дзяржаўным экзамене кожнаму студэнту адводзіцца не менш 30 хвілін, на здачу дзяржаўнага экзамену адводзіцца да 30 хвілін. Для ўдакладнення экзаменацыйнай адзнакі члены ДЭК могуць задаваць студэнту адпавядаючыя праграме дадатковыя пытанні. Вынікі здачы дзяржаўнага экзамену абвяшчаецца ў той жа дзень пасля афармлення адпаведных пратаколаў.

## ЗМЕСТ ЭКЗАМЕНУ

## РАЗДЗЕЛ I. ТЭОРЫЯ І МЕТОДЫКА МУЗЕЙНАЙ СПРАВЫ

### *Тэма 1. Музеязнаўства як навуковая дысцыпліна*

*Гісторыя станаўлення музеязнаўства.* Перыядызацыя музеалогіі. Этапы развіцця музеалогіі.

Данавуковая стадыя развіцця музеалогіі (сярэдзіна XVI – канец XIX ст.). Першыя даследаванні па музеалогіі. Эмпірычна-апісальная стадыя (канец XIX ст. – 1960-я гг.). Тэарэтычныя пытанні музеязнаўства ў першых перыядычных выданнях. Прафесіяналізацыя музейнага сектара. Пошук новых мадэляў музея ў канцы XIX – пачатку XX ст. Стадыя тэорыі і сінтэзу (1960-я гг. – пачатак XXI ст.). Фарміраванне нацыянальных школ. Заходнееўрапейская (працы К. Хадсана, Д. Льюіса, Ж. А. Рыўера, Ю. Ромедэра, Д. Камерона, А. Хупер-Грынхіл і інш.), усходнееўрапейская (працы Й. Бенеша, З. Странскага, І. Неуступнага, І. Ян, В. Хербста, К. Шрайнера, В. Глузіньскага, У. Свяцімскага і інш.), амерыканская (Д. Камерон, В. Вошберн, Ж. Баркоў і інш.), савецкай (даследаванні А. М. Разгона, М. Б. Гнядоўскага, У. Ю. Дукельскага, А. І. Міхайлоўскай, С. А. Каспарынскай, Д. А. Равіковіч і інш.). Стварэнне і дзейнасць ІКОFOM. Кірункі сучасных музеязнаўчых даследаванняў на постсавецкай прасторы.

Музеязнаўства ў Рэспубліцы Беларусь. Працы А. А. Гужалоўскага, А. М. Калбаскі, А. Б. Сташкевіч, В. У. Міронччык і інш. Метадычная дзейнасць Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры ў галіне музеязнаўства. Выданне “Музейных сшыткаў”. Дысертацыйныя даследаванні ў галіне музеязнаўства.

*Музеязнаўства як навуковая дысцыпліна.* Вызначэнне музеязнаўства. Аб’ект музеязнаўства. Фарміраванне ўяўленняў аб уласным прадмеце музеязнаўства. Праблема трактоўкі прадмета музеязнаўства. Канцэптуальныя падыходы да вызначэння прадмета музеязнаўства. Прадмет музеязнаўства.

Праблемнае поле музеязнаўства.

Структурна-функцыянальны падыход да музеязнаўства. Складовыя элементы музеязнаўства.

Уласная тэрміналогія як прыкмета самастойнай навуковай дысцыпліны. Тэрміналагічныя праблемы навукі. Фарміраванне паняційнага апарату музеязнаўства. Выданне тэрміналагічных слоўнікаў па музеязнаўству (1986, 2009, 2012, 2022).

Метад як прыкмета навукі. Дыскусія аб метадзе музеязнаўства. Асаблівасці і характарыстыкі метада музеязнаўства. Агульнанавуковыя і спецыяльнанавуковыя метады профільных і сумежных навук у сістэме метада музеязнаўства.

Міждысцыплінарнасць музеязнаўства як спецыфічная сутнасць гэтай сферы ведаў. Музеязнаўства і іншыя сферы навуковых ведаў: агульнагуманітарныя, профільныя. Суадносіны і ўнутраныя сувязі.

### *Тэма 2. Музейны прадмет у структуры музейнай дзейнасці*

З’яўленне ўяўленняў аб спецыфіцы музейных прадметаў. Праца І. Д. Майёра. Фарміраванне паняццяў для абагульнення разнастайнасці назапашаных музейных скарбаў.

Погляды на музейных прадмет М. Ф. Фёдарава. Распрацоўка музейна-прадметнай праблематыкі ў 1920-30-я гг. Працы Ф. І. Шміта, М. М. Дружыніна. Роля І Усерасійскага музейнага з’езда ў зніжэнні цікавасці да праблем тэорыі музейнага прадмета.

Выданне “Асноў савецкага музеязнаўства” (Масква, 1955). Зацвярджэнне тэрміна “музейны прадмет” у музеязнаўчай практыцы. Тэарэтычныя распрацоўкі савецкіх, айчынных і замежных навукоўцаў 1960-1980-х гг.

Змест паняцця “музейны прадмет”. Эвалюцыя вызначэнняў паняцця “музейны прадмет”. Суаднясенне паняццяў: прадмет музейнага значэння – музейны прадмет – музейны экспанат. Музейны прадмет – як крыніца ведаў і эмацыянальнага ўздзеяння. Асноўныя ўласцівасці музейнага прадмета. Паняцце “музеальнасці / музейнасці”.

Аналіз каштоўнасці музейнага прадмета. Паняцце тыповых і ўнікальных музейных прадметаў. Музейная каштоўнасць.

Функцыі музейнага прадмета.

Вызначэнне музейнага прадмета з пазіцыі камунікацыйнага падыходу ў музеязнаўстве. Месца музейнага прадмета ў мадэлях акта музейнай камунікацыі Д. Камерона і А. Хупер-Грынхіл. Музейныя прадметы як знакі музейнай мовы.

Пашырэнне зместу музейнага прадмета. Нематэрыяльная спадчына як аб’ект музейнага калекцыяніравання. Магчымасці і межы выкарыстання нерухомых помнікаў гісторыі і культуры ў музейных мэтах. Абагульненне інфармацыі аб гэтай катэгорыі помнікаў і падрыхтоўка да іх уключэння ў экспазіцыйны ансамбль ці да самастойнага паказу.

### *Тэма 3. Музейнае крыніцазнаўства*

Праблема вызначэння крыніцы. Дваістая прырода гістарычнай крыніцы. Музейны прадмет як гістарычная крыніца. Суаднясенне паняццяў музейны прадмет – гістарычныя крыніца.

Аб’ект і прадмет музейнага крыніцазнаўства. Погляды А. М. Разгона, Н. П. Фінягінай, Я. А. Варанцовай, Н. Г. Самарынай і інш. Акцэнт на вывучэнні семантычнай інфармацыі і спецыфічных уласцівасцяў музейных прадметаў. Традыцыйнае і нетрадыцыйнае крыніцазнаўства. Класіфікацыя крыніц. Прынцыпы класіфікацыі. Статычныя і дынамічныя крыніцы.

Крыніцазнаўчая эўрыстыка. Крыніцазнаўчая крытыка.

### *Тэма 4. Музей як сацыякультурны інстытут*

*Транфармацыя сэнсу музея ў гісторыі.* Этымалогія паняцця “музей”. Тэорыі паходжання музеяў. Этапы фарміравання музея як сацыяльнага інстытута.

Музей у грэка-рымскай цывілізацыі: музей як сінкрэтычны храм навук, мастацтваў і памяці, як спецыялізаваны навуковы комплекс, які ўвасабляе пазнавальны погляд на акаляючае асяроддзе. Музей у культуры Адраджэння. Музей у культурнай традыцыі эпохі Асветы.

Ідэі нацыянальнага музея. Праекты Ф. Адэлунга, Б. Віхмана, Т. Зана і інш.

Разнастайнасць мадэляў музея ў канцы XIX – пачатку XX ст. Праект "ідэальнага" музея М. Ф. Фёдарава і яго філасофская канцэпцыя. Канцэпцыя "карыснага музея" Дж. К. Даны. Ідэя дэмакратызацыі музея ў ЗША. Функцыі і мэта "жывога" музея. Паняцце "музейнага прадмета" (па Дж. К. Дану). Канцэпцыя "жывога музея" П. А. Фларэнскага. Асаблівасці музея-храма.

Музей у эпоху постмадэрнізму. Традыцыі і навацыі ў дзейнасці музея па адборы, захаванні і інтэрпрэтацыі прыродных і гісторыка-культурных аб'ектаў і прадметаў у сучасных умовах. Ідэі "музея без сцен" (А. Мальро), "музея-кантэксту" (П. Мейран), "экамузея" (Ж. А. Рыўер) і рэаліі музейнай дзейнасці. Сучаснае разуменне музея ў працах В. У. Бяззубавай, У. М. Грусмана, Т. П. Калугінай, А. М. Масценіцы, В. С. Сапанжы, Л. М. Шляхцінай і інш.

*Сацыяльная і культурная сутнасць музея.* Вызначэнне тэрміна "музей". Падыходы да вызначэння тэрміна "музей". Сацыякультурныя функцыі музея, іх стабільнасць і дынамізм. Прагнозы эвалюцыі функцый музея. Формы рэалізацыі музеямі сваіх сацыяльных функцый.

Тыпалогія і класіфікацыя музея як дыскусійная праблема. Сучасныя класіфікацыі музеяў па сутнасным прыкметам. Крытэрыі для вылучэння груп музеяў. Паняцце "профіль музея" і профільная класіфікацыя. Класіфікацыя па адміністрацыйнай прыкмеце. Класіфікацыя музеяў па юрыдычнаму прынцыпу. Класіфікацыя музеяў па прыкмеце грамадскага прызначэння. Класіфікацыя па спосабу дакументавання рэальнасці.

Паняцце "музейная сетка". Структура, дынаміка і агульныя тэндэнцыі развіцця музейнай сеткі Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе.

### *Тэма 5. Тэарэтычны базіс музеязнаўства*

*Тэорыя дакументавання ў музеязнаўстве.* Паняцце навуковага дакументавання ў сучасным музеязнаўстве. Навуковае дакументаванне з'яў, працэсаў развіцця прыроды і грамадства як спецыфічны тып музеалагічнага даследавання.

Мэта і сэнс дакументавання. Прынцыпы і крытэрыі дакументавання. Кагнітыўна-каштоўнасны характар музейнага дакументавання.

Абумоўленасць характару дакументавання тыпам і профілем музея. Праблема навуковага дакументавання жывых, дзеючых сацыяльных сістэм. Дакументаванне сучаснасці.

*Тэорыя тэзаўрыравання ў музеязнаўстве.* Паняцце тэзаўрацыі і яе інтэрпрэтацыя ў сучасным музеязнаўстве. Тэзаўрацыя як другая ступень вывучэння музейнасці, яе пазнання, уліку і аховы.

Працэс стварэння фонда музейных прадметаў як адзін з элементаў тэзаўрыравання. Музейны фонд як "новая культурная рэальнасць". Паняцці

“музейная калекцыя” і “музейны збор”. Прынцыпы вывучэння музейных збораў як асаблівай мадэлі рэальнага асяроддзя і дакументальнай сістэмы. Класіфікацыя, сістэматызацыя і інтэрпрэтацыя музейных прадметаў у кантэксце тэзаўрыравання. Значэнне навуковай арганізацыі фондаў.

Сучасныя тэхналогіі ўліку музейных прадметаў. Ахова музейных прадметаў і інфармацыі, якая ў іх утрымліваецца, як адзін з элементаў тэзаўрацыі.

*Тэорыя камунікацыі ў музеязнаўстве.* Музейная форма камунікацыі. Роднасць з іншымі формамі культурнай камунікацыі. Тэарэтычныя передумовы з’яўлення камунікацыйнага падыходу ў музеязнаўстве.

Паняцце сацыяльнай мовы. Асноўныя тыпы культурнай і музейнай камунікацыі. Спецыфічнасць музейнай камунікацыі. Асноўныя метадалагічныя канцэпцыі музейнай камунікацыі. Музейна-камунікацыйныя мадэлі.

Эфектыўнасць і шматграннасць музейнай камунікацыі. Міждысцыплінарнае супрацоўніцтва ў працэсе музейнай камунікацыі.

### *Тэма 6. Фонды музея як сістэма*

Вызначэнне паняцця “фонды музея”. Фонды музея як сродак комплекснага дакументавання эвалюцыі прыроды і гісторыі грамадства і крыніца ведаў для профільнай дысцыпліны, аснова экспазіцыйна-выставачнай і навукова-асветніцкай дзейнасці. Адрозненне музейных фондаў ад фондаў бібліятэк і музеяў. Умовы, якім павінны адпавядаць музейныя фонды.

Музейны прадмет як базавае музеалагічнае паняцце і аснова музейнай дзейнасці. Навуковая класіфікацыя музейных прадметаў. Навукова-дапаможныя матэрыялы і іх класіфікацыя.

Навуковая арганізацыя фондаў музея як форма сістэматызацыі музейных калекцый і яго інфармацыйнага забеспячэння. Задачы навуковай арганізацыі фондаў музея.

Структура фондаў па значэнні і юрыдычным стане прадметаў. Фонд музейных прадметаў (аўтэнтычных ці арыгінальных прадметаў). Фонд навукова-дапаможных матэрыялаў. Фонд часовага захавання. Фонд часовага карыстання. Фонд сыравінных матэрыялаў і інш.

Склад фондаў як сукупнасць музейных прадметаў розных тыпаў канкрэтнага музейнага збору. Сістэма навуковай арганізацыі музейных прадметаў. Паняцці “музейная калекцыя”, “музейны збор” і “музейны фонд”. Тыпы музейных калекцый і крытэрыі для іх фарміравання.

### *Тэма 7. Навукова-фондавая дзейнасць музея і яе кірункі*

*Асноўныя кірункі навукова-фондавай работы.* Змест фондавай работы. Палажэнне аб фондава-закупачнай камісіі музея сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Склад і асноўныя напрамкі дзейнасці фондава-закупачнай камісіі. Дакументацыйнае забеспячэнне дзейнасці фондава-закупачнай камісіі.

Нарматыўна-прававое забеспячэнне навукова-фондавай дзейнасці. “Кодэкс аб культуры” і іншыя дакументы.

*Камплектаванне музейных фондаў* як складовы элемент навуковага дакументавання і калекцыяніравання. Асноўныя мэты і задачы камплектавання фондаў музея.

Навуковая канцэпцыя камплектавання музейных фондаў. Арганізацыя работы па камплектаванні фондаў музея. Этапы камплектавання музейных фондаў. Асновы навуковай методыкі камплектавання музейных фондаў. Формы бягучага камплектавання (закупка, абмен, перадача ў дар). Набыццё прадметаў, якія паступаюць непасрэдна ад арганізацый і прыватных асоб.

*Улік музейных фондаў* як кірунак навукова-фондавай работы музея. Паняцце "ўлік музейных фондаў", "уліковая дакументацыя", "сістэма фондавай дакументацыі". Задачы ўліку музейных фондаў. Сістэма двухузроўневага ўліку музейных калекцый. Аўтаматызаваная рэгістрацыя музейных калекцый. Аўтаматызаваныя інфармацыйна-пошукавыя сістэмы музейных фондаў.

Асноўныя віды работ па ўліку музейных фондаў і формы іх дакументавання. Улік новых паступленняў у склад музейнага збору. Прыём музейных прадметаў на пастаяннае захаванне і іх першасная інвентарызацыя. Навуковая інвентарызацыя музейных прадметаў як працэс фіксацыі вынікаў навуковага вывучэння музейных прадметаў. Нанясенне на прадметы ўліковых адзнак. Улік фонду навукова-дапаможных матэрыялаў. Улік прадметаў, якія паступілі на часовае захаванне. Выдача прадметаў асноўнага фонду на часовае захаванне. Перападлік музейнага збору. Зверка наяўнасці музейных калекцый з уліковай дакументацыяй. Перадача і спісанне прадметаў са складу музейнага збору.

Навуковая каталагізацыя музейных фондаў.

*Вывучэнне музейных прадметаў* як кірунак навукова-фондавай работы музея. Паняцце "вывучэнне музейных прадметаў". Атрыбуцыя музейнага прадмета. Вызначэнне аўтэнтычнасці і верагоднасці музейнага прадмета. Вызначэнне каштоўнасці музейнага прадмета. Класіфікацыя і сістэматызацыя музейных прадметаў. Крытычны аналіз і інтэрпрэтацыя музейных прадметаў. Методыка вывучэння і навуковага апісання розных катэгорый музейных прадметаў. Асаблівасці вывучэння музейных прадметаў сучаснасці.

*Захаванне музейных фондаў* як кірунак навукова-фондавай дзейнасці музея. Стварэнне рацыянальнай сістэмы захавання музейных фондаў. Агульныя патрабаванні да архітэктуры музейных будынкаў. Фондасховішча і яго абсталяванне. Асобнае і комплекснае захаванне музейных прадметаў.

Пажарная сістэма бяспекі фондасховішчаў. Ахова музейных прадметаў у экстрэмальных сітуацыях. Захаванне музейных прадметаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў. Рэжымы захавання музейных фондаў. Спосабы і сродкі прафілактыкі і апрацоўкі забруджаных матэрыялаў.

### *Тэма 8. Тэарэтычныя і гістарычныя аспекты культурна-адукацыйнай дзейнасці музея*

*Музейная педагогіка як навуковая дысцыпліна.* Перадумовы станаўлення музейнай педагогікі як навуковай дысцыпліны.

Вызначэнне дысцыпліны. Музейная педагогіка як галіна міждысцыплінарных навуковых ведаў і пабудаванай на яе аснове практычнай дзейнасці сучаснага музея. Аб'ект і прадмет музейнай педагогікі.

Мэты і задачы даследаванняў у галіне музейнай педагогікі.

Асноўныя напрамкі даследаванняў у галіне музейнай педагогікі.

*Педагагічныя асновы культурна-адукацыйнай дзейнасці* музея. Рэалізацыя адукацыйна-выхаваўчай функцыі ў музеі. Сродкі выхавання ў музеі: музейныя прадметы і музейнае асяроддзе. Адукацыйны патэнцыял музейных прадметаў. Музейнае асяроддзе як важны фактар сучаснага адукацыйнага працэсу.

Асноўныя катэгорыі і тэрміналагічны апарат музейнай педагогікі. Паняцце музейна-педагагічнага працэсу. Структура і этапы музейна-педагагічнага працэсу. Музейна-педагагічныя прынцыпы.

*Асноўныя этапы культурна-адукацыйнай дзейнасці* музея. Характарыстыка асноўных этапаў культурна-адукацыйнай дзейнасці музея. Культурна-асветніцкая работа. Палітыка-асветніцкая дзейнасць. Навукова-асветніцкая работа. Ідэйна-выхаваўчая дзейнасць. Музейная педагогіка і культурна-адукацыйная дзейнасць. Залежнасць перыядызацыі культурна-адукацыйнай дзейнасці ад змены мадэляў музея і яго адукацыйнай канцэпцыі.

### *Тэма 9. Формы і метады культурна-адукацыйнай дзейнасці музея*

*Формы ўзаемадзеяння музея і яго аўдыторыі.* Класіфікацыя формаў культурна-адукацыйнай дзейнасці музея. Экскурсія як асноўная форма. Спецыфіка і сутнасць музейнай экскурсіі. Класіфікацыя экскурсій. Методыка падрыхтоўкі і правядзення экскурсіі.

Іншыя базавыя формы культурна-адукацыйнай дзейнасці музея. Асноўныя характарыстыкі базавых форм культурна-адукацыйнай дзейнасці музея.

Музейная лекцыя і яе спецыфіка. Асаблівасці музейных клубаў, гурткоў і студый. Правядзенне конкурсаў, алімпіяд, віктарын і інш. на музейную тэматыку.

Новыя формы культурна-адукацыйнай дзейнасці музея. Музейнае свята. Музейныя заняткі. Музейная гульня (музейныя квэсты). Майстар-класы. Фестывалі, рэканструкцыі ў музеі.

*Метады культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў.* Псіхалагічныя асаблівасці ўспрымання музейнай інфармацыі рознымі катэгорыямі наведвальнікаў. Залежнасць метадаў работы ад характарыстыкі музейнай аўдыторыі.

Асноўныя метады работы з дашкольнікамі і малодшымі школьнікамі. Асаблівасці работы з вучнямі сярэдніх і старшых класаў. Спецыфіка работы са студэнтамі. Асаблівасць методыкі работы музея з сямейнымі і адзінкавымі наведвальнікамі. Інклюзіўныя праграмы ў музеі.

### *Тэма 10. Музейная аўдыторыя як аб’ект даследавання*

Вызначэнне музейнай аўдыторыі. Параметры для характарыстыкі музейнай аўдыторыі. Дынаміка музейнай аўдыторыі. Вывучэнне адваротнай сувязі паміж музеем і яго аўдыторыяй. Музейная аўдыторыя як аб’ект даследавання. Асаблівасці вывучэння наведвальнікаў музеяў сацыялагічнымі метадамі. Вывучэнне музейнай аўдыторыі ў розных краінах свету.

Паняцце “музейная культура” наведвальніка. Узроўні музейнай культуры. Рэкамендацыі па выхаванні музейнай культуры.

### *Тэма 11. Асаблівасці фарміравання экспазіцый музеяў*

Выстаўка як новая інстытуцыянальная (культурная) форма на мяжы XVII – XVIII ст. Стварэнне Акадэміі мастацтваў у Парыжы і яе ўплыў на фарміраванне экспазіцый музеяў. Праграма пабудовы экспазіцыі выстаўкі, распрацаваная Французскай Каралеўскай Акадэміяй мастацтваў (1780-1790). Перыяд “дэкаратыўнага комплексу”. Роля дэкаратараў Х. Мехеля, Ю. Фельтена і іншых ў стварэнні экспазіцыі. Выставачны “шлягер” як сэнсавы цэнтр экспазіцыі. Першая сістэматычная групіроўка калекцый па школам і майстрам. Групіроўка па зборам і тэматычным прыкметам.

Экспазіцыя эпохі класіцызму. Арсенальная тэхніка. Прынцып гістарызму: гісторыка-сістэматычны і гісторыка-магнаграфічны. “Galleria Progressiva”. Тэхніка экспазіцыі “period rooms”. “Філалагічныя” метады. Канцэптуалізацыя экспазіцыі музея.

Асноўныя накірункі фарміравання экспазіцый мастацкіх музеяў у першай палове ХХ ст. Асноўныя тэндэнцыі фарміравання экспазіцый мастацкіх музеяў у другой палове ХХ – пачатку ХХІ ст. Асаблівасці экспанавання твораў мастацтва (жывапісу і графікі) ў экспазіцыі. Інсталяцыя і перформанс як сродак мастацкага вырашэння экспазіцыі. Канцэптуальныя праекты.

Асаблівасці экспазіцый музеяў гістарычнага профіля ў другой палове ХХ – пачатку ХХІ ст. Праблемы праектавання археалагічных экспазіцый. Экспазіцыі літаратурных музеяў. Прыёмы дэманстрацыі кніг і тэкстаў у музейнай экспазіцыі. Асаблівасці стварэння экспазіцый у музеях пад адкрытым небам. Экалагічныя канцэптуальныя праекты. Куратарскія праекты.

### *Тэма 12. Тэарэтычныя і практычныя аспекты экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці музея*

*Прынцыпы і метады пабудовы экспазіцыі.* Музейная экспазіцыя, асноўныя паняцці. Прынцыпы і метады пабудовы музейнай экспазіцыі. Тэматычная структура экспазіцыі. Экспазіцыйныя комплексы. Асноўныя віды экспазіцыйных матэрыялаў. Музейныя прадметы і навукова-дапаможныя матэрыялы ў экспазіцыі. Карты, дыяграмы, тэксты, этыкетаж, указальнікі.

*Навуковае праектаванне экспазіцыі.* Асноўныя этапы стварэння музейнай экспазіцыі. Навуковая канцэпцыя. Тэматычная структура (ТС). Разгорнутая тэматычная структура (РТС). Фарміраванне тэматыка-экспазіцыйных комплексаў. Тэматыка-экспазіцыйны план (ТЭП). Падрыхтоўка тэкставага і дапаможнага матэрыялу.

Асноўныя прынцыпы мастацкага праектавання экспазіцыі. Асаблівасці мастацкага праектавання музейных экспазіцый. Арганізацыя прадметна-прасторавага асяроддзя. Абсталяванне ў экспазіцыйнай прасторы.

Свет і колер у ансамблі экспазіцыі. Тэорыя “дынамічнага ці фіксіруючага колеру” Ф. Бірэна. Тэорыя “аптымальных колераў” Г. Фрылінга, К. Аўэра. Асацыятыўнасць колеру ў экспазіцыі. Каэфіцыенты адлюстравання. Дыяпазон аптымальных колераў у даследаваннях Я. Б. Рабкіна, Я. І. Рогава.

*Арганізацыя і асноўныя этапы мастацкага праектавання музейных экспазіцый.* Задачы мастацкага праектавання. Асаблівасці мастацкага рашэння музейнай экспазіцыі. Арганізацыя прадметна-прасторавага асяроддзя. Абсталяванне ў экспазіцыйнай прасторы. Святло і колер у ансамблі экспазіцыі. Асацыятыўнасць і каэфіцыент адлюстравання колеру. Графічны дызайн у экспазіцыі. Этыкетаж. Генеральнае рашэнне экспазіцыі. Размяшчэнне асноўных тэм у залах. Выкарыстанне сучасных тэхнічных сродкаў у экспазіцыі. Экспазіцыйны маршрут. Эскізны праект. Размяшчэнне вядучых экспанатаў і тэкстаў. Экспазіцыйны пояс. Прыёмы размяшчэння экспанатаў у экспазіцыйнай прасторы. Рабочае праектаванне. Мантажныя аркушы. Распрацоўка эскізаў і рабочых чарцяжоў. Камунікацыйныя лініі, вентыляцыя і пажарна-ахоўная сігналізацыя. Арганізацыя мастацка-выканаўчых работ. Арганізацыя мантажу экспазіцыі.

### *Тэма 13. Навукова-даследчая дзейнасць музея*

Фарміраванне ўяўленняў аб музеі як навуковай установе. Месца навуковых даследаванняў ў дзейнасці музея. Асаблівасці навукова-даследчай работы музея. Мэты і задачы даследчай дзейнасці музеяў, яе фінансавае і кадравае забеспячэнне.

Класіфікацыя навуковых даследаванняў у музеі. Асноўныя кірункі навукова-даследчай работы ў музеях: музеялагічныя і профільна-навуковыя даследаванні. Даследаванні ў працэсе распрацоўкі навуковай канцэпцыі. Паняцце навуковай канцэпцыі музея.

Навуковыя даследаванні ў сферы навукова-фондавай работы музеяў Навуковыя даследаванні ў працэсе камплектавання фондаў. Музеялагічнае вывучэнне музейных прадметаў, іх пашпартызацыя і каталагізацыя. Паняцце музейнага крыніцазнаўства. Афармленне вынікаў вывучэння музейных прадметаў. Навуковыя даследаванні ў галіне аховы і захавання музейных фондаў. Дзейнасць рэстаўрацыйнага савета.

Навуковыя даследаванні ў галіне музейнай камунікацыі. Навуковыя даследаванні ў працэсе падрыхтоўкі музейнай экспазіцыі. Даследаванні ў галіне музейнай педагогікі, музейнай псіхалогіі і музейнай сацыялогіі.

Профільнанавуковыя даследаванні ў музеях. Музей і краязнаўчыя даследаванні.

Арганізацыя навукова-даследчай дзейнасці музея. Перспектыўнае і бягучае планаванне. Каардынацыя навуковай работы музеяў з іншымі навуковымі ўстановамі, ВНУ, музеямі, установамі-партнёрамі. Формы публікацый і афармлення вынікаў навуковых даследаванняў у музеі. Музейны

архіў: фарміраванне, функцыі і дзейнасць. Пасада навуковага сакратара і яго функцыі. Дзейнасць метадычнага савета ў справе кантралявання і арганізацыі навукова-даследчай дзейнасці музея.

### *Тэма 14. Арганізацыйна-кіраўнічыя асновы дзейнасці музея*

*Музейны менеджмент.* Сістэма менеджмента ў сферы культуры. Культура і рынак. Дзяржаўнае рэгуляванне ў сферы культуры. Асаблівасці маркетынга ў сферы культуры. Спонсарства і мецэнацтва ў культуры.

Заканадаўчыя асновы музейнай дзейнасці. Навуковая, арганізацыйная і тэхнічная структура музея. Адміністрацыйны корпус музея і праблема яго прафесіяналізму.

Праблема праграмавання і фінансавання дзейнасці музея ў сучасных умовах. Спосабы фінансавання. Сістэма работы з персаналам музея. Стымулявання і матывацыі супрацоўнікаў музея.

*Музейны маркетынг.* Паняцце “музейны маркетынг” як спецыфічны від кіраўнічай дзейнасці музея. Асаблівасці выяўлення запытаў рэальных і патэнцыяльных наведвальнікаў музея і метадаў іх задавальнення. Маркетынг як філасофія музейнай вытворчасці. Агульныя і прыватныя крытэрыі эфектыўнасці музейнага маркетынга і навуковыя метады іх вывучэння.

Сувязі музеяў з грамадскасцю (PR). Фарміраванне іміджу музея.

### *Тэма 15. Новыя тэхналогіі ў музейнай справе*

Інфармацыйныя рэвалюцыі і іх роля ва ўдасканаленні інфармацыйнай дзейнасці музея. Прычыны інфармацыйнага крызісу сярэдзіны XX ст., яго праявы ў музейнай дзейнасці. Спосабы пераадолення крызіснай сітуацыі. Асноўная мэта выкарыстання інфармацыйных тэхналогій. Пранікненне інфармацыйных тэхналогій у музей. Першыя музейныя інфармацыйныя сістэмы. Беларускі вопыт інфарматызацыі музейнай дзейнасці.

Аўтаматызаваныя інфармацыйныя сістэмы музея (АІС). Падыходы да стварэння АІС. Стварэнне агульнадзяржаўнай сістэмы ўліку музейных калекцый. Мэты і задачы АІС. Патрабаванні да сістэмы, яе функцыянальныя характарыстыкі. Тыпавыя праектныя рашэнні. Камп’ютарныя і тэхнічныя патрабаванні да функцыянавання АІС у музеі. Тэлекамунікатыўнае забеспячэнне. Камп’ютарныя лакальныя сеткі. Арганізацыя работ па стварэнні і ўкараненні АІС у музеі.

Беларускі вопыт выкарыстання АІС у музеі. Таварыства з абмежаванай адказнасцю навукова-вытворчая фірма “ІНЕАК” і яго роля ў інфармацыйным забеспячэнні дзейнасці беларускіх музеяў. Нацыянальная аўтаматызаваная ўлікова-фондавая сістэма “АМС-5” – “Музей-5”. Яе станоўчыя бакі і недахопы. Мэты і задачы, якія вырашае АІС. Магчымасці АІС. Алічбоўка музейных прадметаў. Значэнне работы з выявамі ва ўсіх відах музейнай дзейнасці.

Інфармацыйныя тэхналогіі ў музейнай экспазіцыі. Інфармацыйныя рэсурсы – абавязковы элемент сучаснай музейнай экспазіцыі. Праблема правамернасці выкарыстання інфармацыйных тэхналогій і якасці зместа дэманструемага ў экспазіцыі інфармацыйнага прадукта. Вопыт стварэння

электронных экспазіцый. Электронны этыкетаж, інфакіёскі, плазменыя панэлі, тачскрыны ў музейнай экспазіцыі.

Музей у інфармацыйнай прасторы. Музейныя электронныя публікацыі і тэхналогія мультымедыя. Электронныя выданні. Музейныя вэб-сайты. Віртуальныя экспанаты, экспазіцыі і выстаўкі. Прадстаўніцтва музеяў у сацыяльных сетках.

## РАЗДЗЕЛ II. АХОВА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

### *Тэма 16. Гісторыка-культурныя каштоўнасці і іх класіфікацыя*

Вызначэнне паняццяў “культурная спадчына”, ”гісторыка-культурная спадчына”, “культурная каштоўнасць”, “гісторыка-культурная каштоўнасць”. Класіфікацыя гісторыка-культурных каштоўнасцей: матэрыяльныя і нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці. Катэгорыі гісторыка-культурных каштоўнасцей. Віды матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Дакументальныя помнікі. Запаветныя мясціны. Помнікі архітэктуры. Помнікі гісторыі. Помнікі горадабудаўніцтва (11 помнікаў горадабудаўніцтва ў Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь). Помнікі мастацтва. Нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці. Катэгорыі гісторыка-культурных каштоўнасцей.

### *Тэма 17. Ахова культурных каштоўнасцей на беларускіх землях у дасавецкі перыяд*

Ахова помнікаў гісторыі і культуры на Беларусі ў перыяд Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі. Імператарскія ўказы (1826, 1848) па зборы сведчанняў аб рэштках старажытнасцяў. Загады і даручэнні (1877, 1903) аб забароне разбурэнняў і перабудовы старажытных аб’ектаў. Дзейнасць Імператарскай археалагічнай камісіі (ІАК). Рэстаўрацыя і кансервацыя замкаў, храмаў. Дзейнасць П. П. Пакрышкіна. Археалагічныя раскопкі на тэрыторыі Беларусі (Е. Р. Раманаў, Г. Х. Татур, Я. Тышкевіч, А. Кіркор, В. А. Шукевіч і інш.). Археалагічныя карты Віленскай і Гродзенскай губерняў (Ф. В. Пакроўскі). Дзейнасць грамадскіх арганізацый па вывучэнні, сістэматызацыі і ахове помнікаў гісторыі і культуры.

### *Тэма 18. Ахова культурных каштоўнасцей у БССР і СССР*

Фарміраванне дзяржаўных органаў па ўліку і ахове помнікаў у першыя гады савецкай улады. Закон “Аб забароне вывазу і гандлю за мяжой прадметаў асаблівага мастацкага і гістарычнага значэння” (1918). Дэкрэт “Аб рэгістрацыі, прыёме на ўлік і ахове помнікаў мастацтва і старажытнасцей, якія знаходзяцца ва ўласнасці прыватных асоб, грамадстваў і ўстаноў” (1918). Стварэнне Губернскіх камітэтаў па справах музеяў і аховы помнікаў мастацтва, старажытнасцей, народнага побыту і прыроды (1918).

Вывучэнне помнікаў гісторыі і культуры ў даваенны час у БССР. Дзейнасць Інстытута беларускай культуры Акадэміі навук БССР.

Вывучэнне культурнай спадчыны ў Заходняй Беларусі. Дзейнасць Міністэрства веравызнання і народнай асветы. Дзейнасць рэстаўрацыйных акругоў і камісій. Інвентарызацыя і рэстаўрацыя помнікаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Другі з’езд рэстаўратараў Польшчы (1927). Закон аб апецы над помнікамі (1928). Улік і ахова помнікаў даўніны XVI-XVIII ст.

Ахова гісторыка-культурнай спадчыны ў пасляваенны перыяд. Дзейнасць Добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Закон БССР

"Об охране памятников культуры" (1969). Закон БССР "Об охране и использовании памятников истории и культуры" (1978).

### *Тэма 19. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны (канец XX – пачатак XXI ст.)*

Заканадаўчыя і нарматыўныя прававыя акты, якія рэгулююць ахову гісторыка-культурнай спадчыны. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (1994). Закон "Об охране историко-культурного наследия" (1992). Закон "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны" (2006). Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры (2016). Беларуская рэспубліканская навукова-метадычная рада і абласныя (Мінскі гарадскі) саветы па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны. Асноўныя задачы і кірункі дзейнасці Рады.

Дзяржаўная палітыка і кіраванне ў сферы культуры. Паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у сферы культуры. Паўнамоцтвы Савета Міністраў і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ў сферы культуры. Кампетэнцыі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, іншых дзяржаўных органаў у сферы культуры.

Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Парадак уключэння культурных каштоўнасцей, якім нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці ў Дзяржспіс. Структура Дзяржспісу.

Фарміраванне міжнароднага заканадаўства ў галіне аховы культурнай спадчыны. Пакт Рэрыха (Вашынгтон, 1935). Дзейнасць Міжнароднай рады па захаванні помнікаў і славутых месцаў (ІКОМАС, 1965). Еўрапейская Канвенцыя аб ахове археалагічнай спадчыны (Лондан, 1969). Канвенцыя аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны (1972). Хартыя захавання гістарычных гарадоў і гарадскіх абшараў "Вашынгтонская хартыя" (Вашынгтон, 1987). Канвенцыя аб ахове падводнай культурнай спадчыны (2001). Міжнародная Канвенцыя аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны (Парыж, 2003).

Спісы сусветнай спадчыны ЮНЭСКА. Спіс Сусветнай культурнай спадчыны, Рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва, Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якая мае патрэбу ў тэрміновай ахове і іншыя спісы ЮНЭСКА ў адпаведнасці з міжнародным заканадаўствам.

### *Тэма 20. Вылучэнне культурнай каштоўнасці для надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці*

Парадак уключэння культурнай каштоўнасці ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей. Вылучэнне культурнай каштоўнасці з ліку існуючых альбо выяўленых. Адпаведнасць яе крытэрыям для надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Фіксацыя, навуковая апрацоўка, мастацкая ацэнка. Накіраванне прапановы ў аблвыканкам, Мінгарвыканкамам.

Прафесійнае выяўленне культурных каштоўнасцей, у тым ліку пры правядзенні археалагічных даследаванняў. Сутнасць прафесійнай навукова-даследчай дзейнасці. Фіксацыя, навуковая апрацоўка і мастацкая ацэнка

выяўленай каштоўнасці. Забяспячэнне мер па ахове выяўленай рухомай і нерухомай матэрыяльнай культурнай каштоўнасці.

Меры па захаванні матэрыяльнай культурнай каштоўнасці. Дзеянні мясцовага выканаўчага і распарадчага органа базавага тэрытарыяльнага ўзроўню пры прафесійным альбо выпадковым выяўленні культурнай каштоўнасці, якой можа быць нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Наданне і пазбаўленне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь. Парадак унясення прапаноў аб наданні культурным каштоўнасцям статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Фіксацыя, навуковая апрацоўка і мастацкая ацэнка культурных каштоўнасцей. Крытэрыі для надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці.

### *Тэма 21. Уліковыя дакументы і Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь*

Пашпарт матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці. Запаўненне пашпарта па форме, устаноўленай пастановай Міністэрствам культуры ад 28 снежня 2016 г. № 89. Звесткі, якія ўносяцца ў пашпарт матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці лістом змяненняў.

Ахоўныя абавязацельствы. Форма ахоўнага абавязацельства ўстаноўленая пастановай Міністэрства культуры ад 28 снежня 2016 г. № 90. Правы, абавязкі і абмежаванні праў уласніка (карыстальніка) матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Дзейнасць мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў базавага тэрытарыяльнага ўзроўню у выпадку змянення звестак аб гісторыка-культурных каштоўнасцях. Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь. . Парадак фарміравання, вядзення і выкарыстання Банка звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь.

### *Тэма 22. Захаванне гісторыка-культурных каштоўнасцей*

Меры па захаванні гісторыка-культурных каштоўнасцей. Сістэма арганізацыйных, прававых, эканамічных, матэрыяльна-тэхнічных, навуковых, інфармацыйных і (або) іншых мер, якія ажыццяўляюцца ў мэтах зберажэння і памнажэння гісторыка-культурнай спадчыны і стварэння ўмоў для яе перадачы наступным пакаленням.

Забеспячэнне захавання нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Перамяшчэнне нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці ў мэтах яе аднаўлення. Агляды нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей. Забеспячэнне захавання рухомых матэрыяльных і нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Ахоўная дошка.

Зоны аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Ахоўная зона. Зона рэгулявання забудовы. Зона аховы ландшафту. Зона аховы культурнага пласта (слоя). Рэжымы утрымання і выкарыстання зон аховы. “Гісторыка-архітэктурны апорны план”. “Схема

ландшафтнага аналізу”. “Схема межаў зон аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці”.

### *Тэма 23. Права ўласнасці на культурныя каштоўнасці*

Прававое рэгуляванне пытанняў уласнасці на гісторыка-культурныя каштоўнасці. Пераважнае права набыцця долі ў праве агульнай уласнасці на гісторыка-культурную каштоўнасць. Рэгістрацыя абмяжаванняў, звязаная са статусам гісторыка-культурнай каштоўнасці. Правы ўласніка матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці. Правы ўласніка калекцыі. Абмежаванне правоў уласніка (карыстальніка) матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці, землекарыстальніка, на зямельным участку якога размешчана нерухомая матэрыяльная гісторыка-культурная каштоўнасць. Абавязкі ўласніка (карыстальніка) матэрыяльнай гісторыкакультурнай каштоўнасці, землекарыстальніка, на зямельным участку якога размешчана нерухомая матэрыяльная гісторыкакультурная каштоўнасць.

### *Тэма 24. Віды работ, якія выконваюцца на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях*

Навукова-даследчыя, праектныя і рамонтна-рэстаўрацыйныя работы. Археалагічныя, архіўна-бібліяграфічныя і натурныя даследаванні. Рамонтна-рэстаўрацыйныя работы: аднаўленне, дапаўненне, кансервацыя, прыстасаванне, перамяшчэнне, рамонт, раскрыццё, рэгенерацыя, рэканструкцыя, Асноўныя прынцыпы рэстаўрацыі. Асаблівасці рэстаўрацыі рухомых і нерухомых культурных каштоўнасцей. Віды кансервацыі. Кансервацыя руін. Методыка рэстаўрацыйных работ

Дазвол на выкананне навукова-даследчых і праектных работ. Выкананне работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях. Кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях. Навукова-метадычнае кіраўніцтва і аўтарскі нагляд. Узгадненне навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях. Прыняцце ў эксплуатацыю нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці, на якой выконваліся рамонтна-рэстаўрацыйныя работы. Адміністрацыйныя працэдуры ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны, якія ажыццяўляюцца Міністэрствам культуры па заявах грамадзян, юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў.

### *Тэма 25. Дакументальныя помнікі. Формы і метады іх захавання*

Віды дакументальных помнікаў: акты дзяржаўных органаў, пісьмовыя, графічныя і аўдыявізуальныя дакументы, старажытныя і іншыя рукапісы, архіўныя дакументы, рэдкія друкаваня выданні).

